# ЧАСТЬ I
# ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ ВОСПИТАНИЯ И ОБУЧЕНИЯ

## МАГЧЫМАСЦІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ЎЗОРУ ЯК СРОДКУ ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ПАЧУЦЦЯЎ У ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

**Абабурка К.М.,** студэнтка 4 курса
(г. Мінск, БДПУ імя М. Танка)
Навуковы кіраўнік – Паздзеева Т.В., канд. пед. навук, дацэнт

Задача патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення ва ўсе часы займала значную ролю. На сучасным этапе яна набывае асаблівую вастрату і актуальнасць.

Беларуская народная педагогіка адводзіць патрыятычнаму выхаванню адно з вядучых месцаў. Фарміраванню высокага пачуцця патрыятызму садзейнічала ўся гісторыя беларускага народа, насычаная барацьбой за сваю незалежнасць, барацьбой супраць сацыяльнага, нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту.

Патрыятызм – любоў і адданасць да сваёй Айчыны, да свайго народа. Любоў да Радзімы уключае: клопат аб будучым сваёй краіны, старанне зрабіць усё магчымае дзеля яе росквіту; павага і гонар за гісторыю, звычаі, традыцыі, культуру і мову свайго роднага краю; заўсёды і ўсюды прызнавацца да свайго народу; прыхільнасць да месца жахарства (гораду, вёскі, вобласці, краіны ў цэлым); гатоўнасць да любых подзвігаў на карысць Радзіме.

Сістэма адукацыі адыгрывае вядучую ролю ў фарміраванні патрыятычных пачуццяў у моладзі, грамадзянскаму выхаванню падрастаючага пакалення. Патрыятычнае выхаванне дзяцей з'яўляецца адной з асноўных задач установы дашкольнай адукацыі. Гэта складаны педагагічны працэс, у аснове якога ляжыць развіццё маральных пачуццяў.

У апошнія гады павысілася цікавасць даследчыкаў (Р.І. Жукоўскай, Н.Ф. Вінаградавай, С.А. Казловай, П.В. Алёшына, Н.В. Мельнікава, Л.Я. Ніканавай, Л.М. Варанецкай, Д.М. Дубінінай, А.Д. Жарыкава, Р.І. Жукоўскай, Н.Ю. Ясевай, М.Ю. Навіцкай, Н.Р. Карматавай, Э.К. Суславай, Ю.В. Мялешка, Т.А. Шаблоўская і інш.) да распрацоўкі пытанняў, звязаных з азнаямленнем дзяцей дашкольнага ўзросту з рознымі бакамі навакольнай рэчаіснасці і выхаваннем ў іх на гэтай аснове любові да роднага краю.

У працэсе выхавання ў старэйшых дашкольнікаў асноў патрыятызму значнае месца належыць народнаму мастацтву. Як неаднаразова адзначалі Л.Б. Гаруновіч, Ю.С. Любімава, Б.М. Сахута і інш., азнаямленне дзяцей з творамі народнага мастацтва пабуджае ў іх першыя вобразныя ўяўленні пра родны край, пра яго культуру, развіццё нацыянальнай самасвядомасці, дазваляе не толькі адлюстраваць ужо сфарміраваныя ў дзіцяці веды аб навакольным, але і выразіць свае адносіны да міру, сваё бачанне яго, праявіць сваё «Я», творчасць, заснаваную на ўяўленні, якая ў гэты перыяд дашкольнага дзяцінства зараджаецца і актыўна развіваецца [1, с. 221].

Значную ролю ў выхаванні патрыятычных пачуццяў у дзяцей адыгрывае беларускі нацыянальны ўзор. Беларускі нацыянальны ўзор (арнамент) – узор, заснаваны на паўторы і чаргаванні элементаў, якія яго складаюць; прызначаецца для ўпрыгожвання розных прадметаў, архітэктурных пабудоў, твораў пластычнага мастацтва і інш. Існуе

Рэпазіторый ВДУ

вялікая колькасць разнастайных узораў, кожны з якіх мае свой канкрэтны сэнс, сімвал [3, с. 3-5].

Перад распрацоўкаю і абгрунтаваннем праграммы, мы правялі дыягностыку ўзроўню развіцця патрыятызму ў дзяцей старэйшага ўзросту. Даследаванне праводзілася з выкарыстаннем наступных метадаў: назіранне, размова з дзецьмі, аналіз адказаў дзяцей, аналіз дзіцячых малюнкаў. Быў выяўлены сэрэдні ўзровень развіцця патрыятызму і нізкія веды пра беларускі народны ўзор.

Намі была распрацавана праграма "Захаваем спадчыну разам" па фарміраванні ўяўленняў аб беларускім народным ўзоры, народна-прыкладным мастацтве ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту.

Мэта праграмы – выпрацаваць у выхаванцаў патрыятычныя пачуцці, развіць цікавасць і павагу да роднага краю і яго культуру на аснове азнаямлення з беларускім народным узорам.

Задачы праграмы:

- Пашырыць уяўленні дзяцей пра беларускі нацыянальны ўзор, яго відах.
- Пазнаёміць з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам Беларусі.
- Выхаваць павагу да роднай культуры, мастацтва, уменне бачыць прыгожае, ганарыцца ім.

Праца праграмы размеркавана па наступных цыклах:

1- "Знаёмства з арнаментам".
2- "Літаратурная старонка".
3- "Мастакі".
4- "Вандроўка ў мінулае".
5- "Будзьма беларускімі!"

Пры арганізацыі дзейнасці выкарыстоўваліся наступныя прыёмы: назіранне; размовы з дзецьмі; выкарыстанне дзіцячых мастацкіх твораў, дыяфільмаў, фотаздымкаў, ілюстрацый (іх разглядванне і абмеркаванне); праслухванне музыкальных твораў; стымуляванне дзіцячай мастацкай творчасці; асабісты прыклад педагога, які любіць сваю працу, сваю краіну, свой горад і які клапоціцца пра будучае Радзімы.

*Табліца 1*

*Праект "Захаваем спадчыну разам" па азнаямленню дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з беларускім народным узорам*

| Назва | Мерапрыемствы | Змест |
|---|---|---|
| Цыкл "Знаёмства з арнаментам" | Занятак "Беларускі ўзор". Дыдактычная гульня "Прадоўжы рад". | Азнаямленне дзяцей з характэрнымі асаблівасцямі беларускага нацыянальнага адзення – арнаментам; удакладненне назваў з тканіны; назваў дэталяў касцюма; фарміраванне ўмення ўспрымаць выразныя сродкі беларускага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва (колер, узор); фарміраванне ўмення маляваць простыя ўзоры арнаменту. Праслухванне беларускай нацыянальнай музыкі. |



Репозиторий ВГУ

| | | |
|---|---|---|
| Цыкл “Літаратурная старонка” | Гутарка “Люблю мой край, старонку гэту”. Паказ ілюстрацыйнага матэрыялу. | Чытанне вершаў (Л. Шырын, З. Бірала, М. Багдановіч), дадатковай літаратуры (Я. Сахута), прагляд ілюстрацый з выявамі мужчынскіх і жаночых народных беларускіх касцюмаў, упрыгожаных арнаментам, разгляданне разнастайных фотаздымкаў, малюнкаў з беларускім нацыянальным арнаментам. |
| Цыкл ”Мастакі” | Аплікацыйная дзейнасць “Юныя мастакі”. | Гутарка па тэме. Стварэнне дэкаратыўнай аплікацыі, упрыгожванне рэчаў хатняга ўжытку фігурамі геаметрычнага арнаменту. |
| Цыкл “Вандроўка ў мінулае” | Экскурсія ў гісторыка-этнаграфічны музей “Пазнаём народнае мастацтва разам”. | Экскурсія ў гісторыка-этнаграфічны музей, сустрэча з народнымі майстрамі, знаёмства з разнастайнамі відамі беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Больш глыбокае знаёмства з ткацтвам і вышыўкай. |
| Цыкл “Будзем беларускімі!” | Конкурс малюнкаў “Упрыгожым адзенне беларускім арнаментам”. | Паказ рэчаў бытавога прызначэння, упрыгожаных геаметрычнымі элементамі. Дэманстрацыя прыкладу упрыгожвання элементаў адзення простымі элементамі беларускага нацыянальнага узору. Самастойнае ўпрыгожванне дзецьмі элементаў адзення. Аналіз малюнкаў. |

Пры паўторным даследаванні было выяўлена, што дзеці маюць высокі ўзровень ведаў аб беларускім народным узоры, развіцця патрыятычных пачуццяў увогуле.

Звесткі паўторнага даследаванні даказваюць, што рэалізацыя нашага праекта "Захаваем спадчыну разам" спрыяе росту ўзроўню ведаў пра Радзіму ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту, выпрацоўвае цікавасць дзяцей да твораў народнага мастацтва, беларускага народнага ўзору. Можна зрабіць вынік аб эфектыўнасці прапанаванай намі праграмы і методыкі яе рэалізацыі па выхаванню ў старэйшых дашкольнікаў пачуццяў патрыятызму ў працэсе азнаямлення з беларускім народным узорам.

Паказчыкамі эфектыўнасці нашай працы сталі: сістэматызацыя і ўзбагачэнне ведаў дзяцей пра Радзіму, пашырэнне іх светапогляду, узроўню пазнавальнай актыўнасці. У гутарках выхаванцы добра арыентуюцца ў прадметным свеце, дэманструюць устойлівае імкненне да яго спазнання. Такім чынам, гэта сведчыць пра тое, што наша праца мае пазітыўныя вынікі.

Рэпазіторый ВДУ

На нашу думку, найбольш эфектыўнымі формамі азнаямлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з беларускім народным узорам з’яўляюцца: экскурсіі ў гісторыка-этнаграфічныя музеі, знаёмтсвы з майстрамі і іх вырабамі, тэматычныя заняткі, дыдактычныя гульні, гутаркі, практычныя і славесныя заданні, прагляд мультымедый, фотаздымкаў, шматлікіх ілюстрацый, конкурсы на лепшы малюнак, аплікацыю і г.д.

Праведзеная праца па выхаванню ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту любві да роднага краю сродкамі беларускага народнага ўзору пацвердзіла гіпотэзу, што у дзяцей можна сфарміраваць пачуцці любві да роднага краю пад уплывам беларускай народнай творчасці, калі ажыцяўляць правільны падбор твораў, якія спрыяюць выхаванню патрыятычных пачуццяў, калі азнаямленне з арнаментам, ды і народнай творчасцю ўвогуле з’яўляецца часткай агульнай сістэмы азнаямлення са з’явамі грамадскага жыцця.

Спіс цытаваных крыніц:


1. Воронецкая, Л.Н. Актуальные проблемыи тенденции современного дошкольного образования: сб. науч. ст. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. Л.Н. Воронецкая, Т.В. Поздеева, Д.Н. Дубинина и др.; под общ. ред. Л.Н. Воронецкой, Т.В. Поздеевой. – Мн.: БГПУ, 2011. – 306 с.
2. Гаруновіч, Л.Б. Дэкаратыўная дзейнасць дашкольнікаў: вучэб. метад. дапам. – Мн.: Нар. Асвета, 1993. – 94 с.: іл.
3. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мн.: Бел Эн, 1996. – 208 с.
4. Сахута, Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: 2-ое выд., перепрац. І дап. / Я.М. Сахута. – Мн.: Беларусь, 2001. – 110 с.: іл.
5. Сілівон, В.А. Навучанне дашкольнікаў дэкаратыўнай творчасці: кн. для выхаваццеляў дзіцячых садкоў. Мн.: Нар. Асвета, 1989. – 111 с.: іл.


## ВОСПИТАТЕЛЬНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ ВИТЕБСКОГО РЕГИОНА В ПАТРИОТИЧЕСКОМ ВОСПИТАНИИ ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА


**Амасович Н.В.,** кандидат педагогических наук, доцент
(г. Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова)


Одним из приоритетных направлений воспитательной системы современных образовательных организаций является патриотическое воспитание. Учреждения дошкольного образования, являясь начальным звеном системы образования, призваны формировать у детей первое представление об окружающем мире, отношение к родной природе, малой Родине, своему Отечеству. Патриотизм – любовь к Родине, ответственность и гордость за нее, желание трудиться на ее благо, беречь и умножать ее богатства – начинает формироваться уже в дошкольном возрасте. Невозможно воспитать чувство собственного достоинства, уверенность в себе, а, следовательно, полноценную личность, без уважения к истории и культуре своего Отечества, к его государственной символике.

За последние годы в системе образования Витебской области были созданы важные заделы, позволяющие в ближайшие годы приступить к реализации принципиально новых и масштабных задач. В регионе осуществляется последовательный курс по формированию идеологии белорусского государства, кристаллизации белорусской

Репозиторий ВГУ